АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
ІНСТЫТУТ МОВАЗНАЎСТВА імя ЯКУБА КОЛАСА

УДК 808.26+808.2] - 54

Гадуйка Людміла Аляксееўна

СЛОВАУТВАРАЛЬНЫЯ ГНЕЗДЫ СКЛАДАНАСУФІКСАЛЬНЫХ НАЗОЎНІКАЎ З ДЗЕЯСЛОЎНЫМ КАМПАНЕНТАМ У БЕЛАРУСКАЙ І РУСКАЙ МОВАХ

10.02.01 - беларуская мова
10.02.02 - руская мова

А ў т а р э ф е р а т
дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
кандыдата філалагічных навук

Мінск - 1996

Репозиторий БрГУ

Праца выканана ў аддзеле беларуска-рускіх моўных сувязей Інстытута мовазнаўства імя Я.Коласа АН Беларусі

Навуковы кіраўнік –
кандыдат філалагічных навук А.А.Лукашанец

Афіцыйныя апаненты:
доктар філалагічных навук прафесар А.І.Наркевіч
кандыдат філалагічных навук дацэнт В.М.Бяляеўская

Апаніруючая арганізацыя –
Гомельскі дзяржаўны універсітэт

Абарона адбудзецца "__" _____ 1996 г. у __ гадзін на пасяджэнні Савета па абароне дысертацый Д 01.43.01 у Інстытуце мовазнаўства імя Якуба Коласа Акадэміі навук Беларусі /220072, Мінск, вул. Скарыны, 25/.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа Акадэміі навук Беларусі

Аўтарэферат разасланы "__" _____ 1996 г.

Вучоны сакратар Савета па абароне дысертацый
кандыдат філалагічных навук А.А.Лукашанец

Репозиторий БрГУ

АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

Актуальнасць даследавання. Сярод розных шляхоў папаўнення слоўнікавых саставаў сучасных беларускай і рускай моў адным з самых эфектыўных і пашыраных выступае словаўтварэнне, таму даследаванне асаблівасцей дэрывацыйных працэсаў застаецца актуальным як для беларускага, так і для рускага мовазнаўства. Словаўтваральная сістэма – спецыфічны ўзровень мовы, які мае і свае ўласныя адзінкі даследавання, напрыклад, матываванае слова, словаўтваральны тып, спосаб словаўтварэння і г.д. У апошні час асаблівую ўвагу выклікае словаўтваральнае гняздо (СГ). Такая цікавасць да СГ не выпадковая: гняздо – найбольш складанае, комплекснае аб'яднанне матываваных слоў (яно можа быць прадстаўлена як сукупнасць словаўтваральных пар, словаўтваральных ланцужкоў, словаўтваральных парадыгм), якое дазваляе не толькі вывучаць розныя аспекты словаўтварэння, але і дае магчымасць выявіць асаблівасці сістэмнай арганізацыі і ажыццявіць класіфікацыю лексічнага складу мовы з пункту гледжання сэнсавых (дэрывацыйных) узаемасувязей[1]. Таму не толькі словаўтваральная сістэма, але і наогул лексічная сістэма мовы можа быць прадстаўлена як сістэма словаўтваральных гнёзд.

У адпаведнасці з гэтым, актуальным уяўляецца вывучэнне канкрэтных груп СГ: СГ пэўнай часціны мовы, СГ слоў канкрэтнай лексіка-семантычнай групы, СГ слоў з аднолькавай словаўтваральнай структурай і г.д.

Сярод матываваных адзінак у беларускай і рускай мовах асобнае месца займаюць складаныя словы. З аднаго боку, кампазіт члянімы, ён – аб'яднанне мінімум дзвюх асноў (слоў) і, такім чынам, уваходзіць мінімум у два СГ. З другога, у працэсе ўжывання складанае слова імкнецца быць простым, у прыватнасці (як і простае слова), выступае матывавальнай базай для іншых слоў. Актуальнасць вывучэння гнёзд складаных слоў абумоўлена таксама і тым, што складанне з'яўляецца адным з самых актыўных спосабаў словаўтварэння сучасных беларускай і рускай моў.

Пытанне пра месца і паводзіны кампазіта ў СГ у рускім мовазнаўстве застаецца адкрытым, а ў беларусістыцы не закраналася зусім. Праблема словаўтваральнага патэнцыялу складаных слоў – ха-

---

Заўвага. Беларуская мова: Энцыклапедыя / Беларус.Энцыклапедыя; Пад. рэд. А.Я.Міхневіча. – Мінск: БелЭн, 1994. – С.15.

Репозиторий БрГУ

ця ў рускім мовазнаўстве ёсць працы, прысвечаныя дэрывацыйным магчымасцям асобных груп кампазітаў на матэрыяле словаўтваральнага гнязда (Я.Л.Гінзбург) і словаўтваральнай парадыгмы (А.Ш.Алтаева) – застаецца актуальнай і для беларускай, і для рускай моў.

Для тыпалогіі падабенстваў і адрозненняў у спосабах утварэння, у словаўтваральных сродках і словаўтваральных значэннях, для прадказальнасці ўзнікнення пэўнага дэрывата ў той ці іншай мове несумненна актуальным з'яўляецца супастаўляльнае даследаванне СГ кампазітаў у блізкароднасных беларускай і рускай мовах.

Мэты і задачы даследавання. Дысертацыя прысвечана вывучэнню словаўтваральных гнёзд складанасуфіксальных назоўнікаў з дзеяслоўным кампанентам у беларускай і рускай мовах. Для дасягнення гэтай мэты ў рабоце ставяцца наступныя канкрэтныя задачы:

– устанавіць корпус складанасуфіксальных назоўнікаў у беларускай і рускай мовах; выявіць, якія моўныя адзінкі могуць выступаць адпаведнікамі такіх слоў у другой блізкароднаснай мове;

– апісаць семантычныя групы і структурныя тыпы разглядаемых дэрыватаў у беларускай і рускай мовах; правесці супастаўляльны аналіз словаўтваральных фармантаў у беларускай і рускай мовах;

– даследаваць парадыгматычныя адносіны ў СГ складанняў; вызначыць фактары, якія ўплываюць на ўзнікненне сінанімій, антанімій, аманімій, полісемій ў СГ;

– акрэсліць састаў СГ, якія ўзначальваюцца складанасуфіксальнымі назоўнікамі, у беларускай і рускай мовах;

– устанавіць структуру гнёзд кампазітаў розных семантычных груп і яе характэрныя асаблівасці;

– апісаць матываваныя адзінкі ў СГ па параметрах: ступень дэрывацыі, словаўтваральная зона, матывавальная база, словаўтваральнае значэнне, словаўтваральны фармант; правесці супастаўляльны аналіз словаўтваральных фармантаў і ўстанавіць адпаведнасці паміж рознымі катэгорыямі дэрыватаў у беларускай і рускай мовах;

– выявіць фактары, якія абумоўліваюць структурна-семантычную будову СГ;

– даць супастаўляльную характарыстыку структурнай арганізацыі СГ і семантычных адносін паміж матываванымі словамі СГ кампазітаў у беларускай і рускай мовах.

Навуковая навізна даследавання. У дысертацыі ўпершыню праведзена структурна-семантычнае апісанне словаўтваральных гнёзд складанасуфіксальных назоўнікаў з дзеяслоўным кампанентам у бела-

Репозиторий БрГУ

рускай і рускай мовах. Прапанаваныя ў працы параметры апісання СГ дазволілі выявіць структурныя і семантычныя тыпы матываваных адзінак на кожнай ступені дэрывацыі.

Упершыню СГ складанасуфіксальных назоўнікаў у беларускай і рускай мовах разгледжаны як лексічныя мікрасістэмы, паміж членамі якіх устанаўліваюцца парадыгматычныя адносіны, даследаваны фактары, што абумоўліваюць узнікненне сінанімії, антанімії, аманімії, полісеміі.

Упершыню на беларускім матэрыяле вывучаны месца і паводзіны кампазіта ў саставе СГ, разгледжаны словаўтваральны патэнцыял складаных слоў названай структуры. Не праводзілася раней і супастаўляльнае апісанне СГ кампазітаў у беларускай і рускай мовах.

Тэарэтычная і практычная вартасць даследавання. Даследаванне СГ складаных слоў з'яўляецца істотным для разумення асаблівасцей сістэмнай арганізацыі словаўтварэння (словаўтваральная сістэма як сукупнасць словаўтваральных гнёзд) беларускай і рускай моў, для выяўлення напрамкаў (як агульных, так і спецыфічных) развіцця словаўтваральных сістэм і шляхоў папаўнення лексічных саставаў дзвюх блізкароднасных моў.

Матэрыялы дысертацыі могуць быць выкарыстаны ў ВНУ пры выкладанні курсаў "Сучасная беларуская мова. Словаўтварэнне", "Сучасная руская мова. Словаўтварэнне", спецкурсаў і спецсемінараў па словаўтварэнні, пры напісанні вучэбных дапаможнікаў па гэтым раздзеле мовазнаўства.

Вынікі супастаўляльнага даследавання могуць знайсці прымяненне пры стварэнні перакладных, у тым ліку і гнездавых, слоўнікаў, у практыцы навучання рускай мове ва ўмовах Беларусі, пры падрыхтоўцы адпаведных раздзелаў супастаўляльных граматык беларускай і рускай моў.

Прынцыпы пабудовы і апісання СГ могуць быць улічаны пры стварэнні гнездавога словаўтваральнага слоўніка беларускай мовы.

Палажэнні, што выносяцца на абарону.

1. Семантычная разнастайнасць складанасуфіксальных назоўнікаў з дзеяслоўным кампанентам у беларускай і рускай мовах абумоўлена лексіка-граматычнай прыналежнасцю другога (радзей трэцяга) кампанента – да класа дзеясловаў.

2. Парадыгматычныя адносіны ў СГ кампазітаў або адлюстроўваюць аналагічныя сувязі паміж асновамі складаных слоў, або узніка-

Репозиторий БрГУ

юць у працэсе словаўтварэння.

3. Прыналежнасць кампазітаў – вяршынь СГ да пэўнай семантычнай групы прадвызначае падабенства ў словаўтваральных значэннях матываваных адзінак і агульнасць фармальных сродкаў пры іх утварэнні.

4. На словаўтваральны патэнцыял складанасуфіксальных слоў уплываюць такія фактары, як ужывальнасць, экспрэсіўнасць і прыналежнасць/непрыналежнасць да тэрміналагічнай лексікі выходнага слова СГ.

5. Структура СГ з выходнымі кампазітамі – міжмоўнымі эквівалентамі для значнай часткі гнёзд аднолькавая. Пры несупадзенні структуры СГ у беларускай і рускай мовах паміж такімі гнёздамі не існуе прынцыповых адрозненняў (несупадзенне 1–2 ліній графаў СГ).

Матэрыял даследавання. Аб'ектам даследавання паслужылі 1171 беларускіх і 1517 рускіх складанасуфіксальных назоўнікаў з дзеяслоўным кампанентам, а таксама дэрываты ад іх, атрыманыя метадам суцэльнай выбаркі з "Тлумачальнага слоўніка беларускай мовы" ў 5 тамах, 6 кнігах (Мн., 1977–1984), "Слоўніка беларускай мовы" пад рэд. М.В.Вірылы (Мн., 1987), двухтомнага "Словообразовательного словаря русского языка" А.М.Ціханава (М., 1990), слоўнікавых матэрыялаў "Новое в русской лексике" (8 выпускаў: М. 1980–1982, 1984, 1986–1987, 1989) і "Новые слова и значения" (2 выпускі: М., 1973, 1984).

325 беларускіх і 545 рускіх кампазітаў узначальваюць словаўтваральныя гнёзды. Рускія СГ выбраны з гнёзд "Словообразовательного словаря ...", некаторыя СГ дапоўнены неалагізмамі, што фіксуюцца слоўнікавымі матэрыяламі "Новые слова и значения" і "Новое в русской лексике". Беларускія гнёзды пабудаваны аўтарам.

Усе кампазіты, а таксама матываваныя імі словы прааналізаваны з пункту гледжання семантычнай структуры, для гэтага былі выкарыстаны тлумачальныя слоўнікі: у першую чаргу "Тлумачальны слоўнік беларускай мовы" і "Словарь современного русского литературного языка" ў 17 тт., у рускай мове дадаткова прыцягнуты "Словарь русского языка" пад рэд. А.П.Яўгеньевай у 4 тт., "Толковый словарь русского языка" пад рэд. Д.М.Ушакова ў 4 тт., "Новое в русской лексике. Словарные материалы" і "Новые слова и значения. Словарь-справочник по материалам прессы и литературы...".

Пры выяўленні беларуска-рускіх (руска-беларускіх) адпаведні-

Репозиторий БрГУ

каў выкарыстоўваліся "Белорусско-русский словарь" (Мн., 1988-1989) і "Русско-белорусский словарь" (Мн., 1982).

Метады даследавання. Мэты і задачы працы абумовілі выбар апісальнага і супастаўляльна-тыпалагічнага метадаў як асноўных у даследаванні. Выкарыстаны таксама элементы статыстычнага метаду і прыёмы словаўтваральнага аналізу. Апісанне словаўтваральных гнёзд ажыццяўлялася пры дапамозе метаду мадэліравання.

Апрабацыя вынікаў дысертацыі. Асноўныя палажэнні і вынікі дысертацыі прайшлі апрабацыю на наступных канферэнцыях: "Словам адраджаць чалавека. Да 100-годдзя з дня нараджэння М.І.Гарэцкага" (Брэст, 1993), IV Карскія чытанні (Гродна, 1993), "Беларуска-руска-польскае супастаўляльнае мовазнаўства і літаратуразнаўства"(Віцебск, 1994), навуковая канферэнцыя, прысвечаная 100-годдзю акад. В.У.Вінаградава (Мінск, 1995),"Адзінства ўсходнеславянскіх народаў: мінулае, сучаснасць, перспектывы" (Гомель,1995).

Па тэме дысертацыі апублікавана 6 навуковых прац.

Дысертацыя абмеркана на пасяджэнні аддзела беларуска-рускіх моўных сувязей Інстытута мовазнаўства імя Я.Коласа АН Беларусі.

Структура і аб'ём дысертацыі. Дысертацыя складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі працы, трох глаў, вывадаў, спісу выкарыстаных крыніц (217 адзінак), двух дадаткаў. Агульны аб'ём работы - 163 старонкі, літаратура займае 19 старонак, дадаткі - 33, табліцы (14) - 5,5 , схемы (21) - 8 .

АСНОЎНЫ ЗМЕСТ РАБОТЫ

Першая глава "Словаўтваральныя гнёзды складаных слоў як аб'ект супастаўляльнага апісання" складаецца з трох раздзелаў.

Першы раздзел уяўляе сабой агляд літаратуры, прысвечанай словаўтваральным гнёздам, розным аспектам кампазіталогіі, супастаўляльнаму вывучэнню СГ і складаных назоўнікаў.

У другім раздзеле даецца азначэнне паняцця "складанае слова". У лінгвістычнай літаратуры не існуе адзінай думкі наконт таго, што належыць лічыць кампазітам. Два падыходы да разумення складанага слова абумоўлены тым, якая прыкмета з'яўляецца дыферэнцыяльнай: словаўтваральная (кампазіт ёсць вынік складання: Д.Э.Разенталь, М.А.Целянкова, М.М.Шанскі і інш.) ці структурная (кампазіт ёсць аб'яднанне мінімум двух знамянальных элементаў: А.А.Васілеўская, З.Ф.Краўчанка, У.У.Лапацін, З.А.Поціха, П.А.Собалева, І.С.Улуханаў і інш.). Паколькі аўтара цікавяць паводзіны

Репозиторий БрГУ

складанага слова ў СГ, у дысертацыі прымаецца першы падыход. Такім чынам, у якасці азначэння кампазіта прапануецца наступнае: складанае слова - лексічная адзінка, што ўяўляе сабой сэнсавае, інтанацыйнае, граматычнае аб'яднанне двух (і болей) паўназначных слоў (асноў) у працэсе складання. Следам за А.І.Маісеевым дысертант адрозніває наступныя віды складанняў: словаскладанне, асновасловаскладанне, асновасклaданне. Асновасклaданне звычайна суправаджаецца суфіксацыяй (у тым ліку і нулявой), і ў выніку ўтвараюцца складанасуфіксальныя словы (*б.самавук, р.иноходь*).

Трэці раздзел прысвечаны разгляду спецыфікі СГ кампазітаў, якія вылучаюцца ў самастойную групу. З аднаго боку, складанае слова ўяўляе сабой вынік пэўных дэрывацыйных крокаў і ўваходзіць мінімум у два словаўтваральныя гнязды. Напрыклад, беларускі назоўнік *самазвал* адносіцца да гнёзд з выходнымі *сам* і *валіць*, рускае слова *дальномер* з'яўляецца членам СГ з вяршынямі *далёкий* і *мерить*:

б.сам
сам-а-звал-ø

р.далёкий
даль-ø
даль-н(ий)
дальн-о-мер-ø

б.валіць
з-валіць
сам-а-звал-ø

р.мерить
дальн-о-мер-ø

З другога боку, кампазіт можа выступаць матывавальнай базай для іншых слоў, г.зн. з'яўляцца вяршыняй СГ:

б.самазвал
самазваль-н(ы)
аўта/самазвал
электр-а-самазвал

р. дальномер
дальномер-щик
дальномер-н(ый)
радио/дальномер
свет-о-дальномер
светодальномер-н(ый)

У другой главе "Словаўтваральныя гнёзды складанасуфіксальных назоўнікаў з дзеяслоўным кампанентам у беларускай і рускай мовах" даследуюцца паводзіны кампазітаў у СГ.

Першы раздзел. Параўнанне беларускіх і рускіх СГ, у склад якіх уваходзяць кампазіты з дзеяслоўным кампанентам, дазволіла выявіць наступныя тыпы суадносін паміж складанасуфіксальнымі назоўнікамі і іх адпаведнікамі ў блізкароднасных мовах.

Репозиторий БГУ

Для значнай часткі разгледжаных назоўнікаў у адной мове (беларускай ці рускай) адпаведнікам у другой з'яўляецца складанасуфіксальны дэрыват з дзеяслоўным кампанентам. У межах адной семантычнай групы такія міжмоўныя эквіваленты адносяцца, зразумела, да адной словаўтваральнай катэгорыі. Што тычыцца словаўтваральных тыпаў, то яны могуць быць: А) тоеснымі: б.і р. N+V+ -ец->N : *байкапісец-баснописец*, Б) рознымі: б.N+V+ -нік->N//р.N+ V+ -тель->N: *плямавыводнік-пятновыводитель*, дзе N - аснова назоўніка (ці назоўнік), V - дзеяслова. Асновы складанняў пры гэтым могуць як супадаць (б.*мухамор*-р.*мухомор*), так і адрозніваца (б.*вершатворства-р.стихотворство*, б.*прасадзёрка-р.просорушка*).

Падставай для вылучэння міжмоўных адпаведнікаў з'яўляецца супадзенне іх лексічнага значэння, г.зн. што семантычныя аб'ёмы кампазітаў у беларускай і рускай мовах супадаюць поўнасцю ці часткова (апошняе добра адлюстроўваюць полісемантычныя назоўнікі).

Складанасуфіксальным назоўнікам у блізкароднасных мовах могуць таксама адпавядаць моўныя адзінкі іншага тыпу:

А) просты назоўнік:

б.N+V+суф.->N //р.V+суф.->N : *злачынец-преступник*,

р.N+V+суф.->N //б.N+суф.->N : *судомойка-пасудніца* і г.д.;

В) асноваслова складанне:

б.N+V+суф.->N //р.N+VN->N , дзе VN - другі кампанент, роўны аддзеяслоўнаму назоўніку: *дзетараджэнне-деторождение* (рождение),

р.N+V+суф.->N //б.N+VN->N :*ситовейка-сітавеялка* (веялка);

В) вытворна-складанае слова:

б.Nr+V+суф.->N //р.A+суф.->N, дзе Nr - аснова лічэбніка, А - прыметніка: *першацёлка-первотёлка* (ад *первотельный*: Nr+V+суф.->A);

Г) намінатыўнае словазлучэнне - НСЗ (часцей у бел. мове): р.N+V+суф.->N //б.НСЗ : *крысоловка-пастка на пацукоў*.

У другім раздзеле даецца характарыстыка асноўных семантычных груп і структурных тыпаў складанасуфіксальных назоўнікаў з дзеяслоўным кампанентам.

На семантычную разнастайнасць даследуемых кампазітаў накладвае адбітак лексіка-граматычная прыналежнасць іх кампанентаў. Паколькі ўсе складаныя назоўнікі маюць у сваёй структуры дзеяслоўную аснову, то яны так ці інакш характарызуюць дзеяслоўнае дзеянне і называюць: 1) дзеяча, адушаўлёнага (б.*каменялом*, б.*пладажыл*, р.*канатоходец*, *древоточец*) або неадушаўлёнага (б.*хвалялом*, *каста-*

Репозиторий БрГУ

лом, р.газотурбоход, р.каучуконос); 2) дзеянне (*б.ледалом, сухаядзенне, р.иноходь, всезнайство*); 3) месца дзеяння (*б.каменяломня, р.селитроварня*); 4) час дзеяння (*б.крыгалом, р.мясоед*).

У адпаведнасці з мэтамі даследавання (адна з іх - выяўленне залежнасці паміж семантыкай выходнага слова СГ і структурна-семантычнай арганізацыяй гнязда) вылучаны чатыры асноўныя семантычныя групы складанасуфіксальных назоўнікаў з дзеяслоўным кампанентам у беларускай і рускай мовах; найменні дзеяча распадаюцца ў сваю чаргу на 4 падгрупы (гл.схему 1) :

Схема 1

Семантыка складанасуфіксальных назоўнікаў з дзеяслоўным кампанентам



У наступных падраздзелах гэтага раздзела даецца структурна-семантычны аналіз вышэйнаэваных груп (падгруп) даследаваных кампазітаў. Пры гэтым у межах кожнай групы вылучаюцца тэматычныя класы складаных слоў, адзначаецца таксама сфера іх ужывання. Пры структурным апісанні кампазітаў звяртаецца ўвага на дзеяслоўныя кампаненты (г.зн. дзеяслоўныя СГ, членамі якіх з'яўляюцца складанасуфіксальныя назоўнікі), што найбольш часта выкарыстоўваюцца пры ўтварэнні той ці іншай семантычнай групы (тэматычнага класа). Аналіз суфіксаў, пры дапамозе якіх утвараюцца дэрываты кожнай семантычнай групы , адбываецца наступным чынам: даецца суфікс у беларускай мове, і да яго прыводзяцца ўсе зафіксаваныя адпаведнікі ў рускай мове. Па выніках такога апісання прапануюцца табліцы "Беларуска-рускія адпаведнікі суфіксаў кампазітаў...", напрыклад,

Репозиторий БрГУ

Табліца 1

Беларуска-рускія адпаведнікі суфіксаў кампазітаў – найменняў дзеяння, яго вынікаў

БЕЛАРУСКАЯ МОВА	РУСКАЯ МОВА
-ств(а)/-ств(о)/-цтв(а)/	-ств(о)/-тельств(о)
-льніцтв(а)	-ениј(е)/-иј(е)/-ј(е)
-ø	-ø
	-тиј(е)
-ø(а)	-ø(а)
-ј(е)	-ј(е)/-иј(е)/-тиј(е)/-т'ј(е)
-л(е)	
-цц(е)	
-дз(е)	
-нн(е)/-енн(е)/-анн(е)	-ениј(е)
-ін(а)/-ын(а)	-ин(а)
-к(а)	-к(а)

Трэці раздзел прысвечаны парадыгматычным адносінам ў словаўтваральных гнёздах складаных назоўнікаў.

Тоеснасць кораня, у якім заключаецца агульнае для ўсіх роднасных слоў лексічнае значэнне, вядзе да таго, што члены СГ складаюць своеасаблівую лексічную мікрасістэму (З.Г.Кеворкава). Паміж яе адзінкамі ўстанаўліваюцца разнастайныя парадыгматычныя сувязі: аманімічныя, полісемічныя, сінанімічныя, антанімічныя. Існаванне такіх адносін у СГ кампазітаў абумоўлена ў абедзвюх мовах як лексічнымі, так і словаўтваральнымі фактарамі:

1) для сінонімаў і антонімаў – сінанімічнасцю (б.*лістаносец/пісьманосец, ледалом/ледарэз*, р.*всезнайство/многознайство, дроворуб/дровосек*) і антанімічнасцю (б.*добразычлівец-злозычлівец*,р.*правосудие-кривосудие, мздодатель-мздоимец*) асноў кампазіта (адлюстраваная лексічная сінанімія, адлюстраваная лексічная антанімія);

2) для сінонімаў, амонімаў і полісемантычных слоў – сінанімічнасцю (б.*сам-а-люб-ø/сам-а-люб-ец*, р.*вод-о-грей-к-а/вод-о-грей-н-я/вод-о-гре-ль/н-я*), аманімічнасцю (р.*мяс-о-ед-ø*1 (час) і *мяс-о-ед-ø*2(асоба)) і шматэначнасцю (б.*мяс-а-руб-к-а* – пра прыстасаванне і пра кровапралітную бітву, вайну; р.*пуст-о-брех-ø* – пра сабаку, які брэша без патрэбы, і пра балбатлівага чалавека) суфіксаў.

Складанасуфіксальныя назоўнікі могуць уступаць у парадыгматычныя адносіны і з іншымі моўнымі адзінкамі: простымі словамі, асновасловаскладаннямі, вытворна-складанымі дэрыватамі.

У трэцяй главе "Структурна-тыпалагічная характарыстыка СГ з выходнымі кампазітамі ў беларускай і рускай мовах" даследуюцца гнёзды з вяршынямі – складанасуфіксальнымі назоўнікамі.

Репозиторий БрГУ

Даследаванне СГ праведзена ў некалькі этапаў.

1.Усе СГ размеркаваны па групах у залежнасці ад семантыкі выходнага слова.

2. У межах адной семантычнай групы аналіз адбываецца па ступенях дэрывацыі: спачатку апісваюцца матываваныя першай ступені, потым – другой і г.д.

3. На кожнай ступені, у залежнасці ад часцінамоўнай прыналежнасці дэрыватаў, вылучаны словаўтваральныя зоны: субстантыўная, ад'ектыўная, дзеяслоўная і прыслоўная. У кожнай зоне апісаны словаўтваральнае значэнне і спосаб утварэння матываваных адзінак; адзначаны таксама тоеснасць/адрозненне словаўтваральных тыпаў у дзвюх блізкароднасных мовах. Вынікі такога апісання на першай ступені дэрывацыі адлюстроўвае "Тыпавая словаўтваральная

Схема 2

Тыпавая словаўтваральная парадыгма кампазітаў – назваў машын, механізмаў, прыстасаванняў у беларускай і рускай мовах

зона	часцінамоўная мадэль	значэнне	фармант (спосаб утварэння) бел.мова	рус.мова
МАТЫВАВАЛЬНЫЯ КАМПАЗІТЫ: субстантыўная зона	NN_1	"асоба"	-чык/-шчык -нік складаненне	-чик/-щик -ник -ец складаненне
	NN_1	"машына, механізм, прыстасаванне"	складаненне абрэвіяцыя -к(а) контр-	складаненне абрэвіяцыя -к(а) контр-
	NN_1	"дзеянне"	складаненне -ств(а)	складаненне -ств(о)
	NN_1	"назвы машын, механізмаў, прыстасаванняў са значэннем суб'ект.ацэнкі"	-чык	-чик -ец -ишк(о) -ищ(е)
	NN_1	"месца"	-дром	-дром
	NN_1	"прадпрыемства, установа"	-ств(а)	-ств(о)
ад'ектыўная зона	NA_1	"які мае адносіны да таго, што названа матывавальным кампазітам"	-н- складаненне проці-...-я-	-н- складаненне противо-...-й-
дзеяслоўная зона	NV_1	"ажыццяўляць дзеянне пры дапамозе таго, што названа матыв. асновай"	-і-ць -ніча-ць	-и-ть -нича-ть

Репозиторий БрГУ

парадыгма кампазітаў у беларускай і рускай мовах", на другой ступені – схема "Матываваныя адзінкі другой ступені дэрывацыі", у якой улічваецца словаўтваральнае значэнне і часцінамоўная прыналежнасць не толькі матываванага, але і матывавальнага, напрыклад,

Схема 3

Матываваныя адзінкі другой ступені дэрывацыі

(СГ кампазітаў – найменняў машын, механізмаў, прыстасаванняў)



4. Для выяўлення сувязей паміж членамі словаўтваральнага гнязда, іх размеркавання па ступенях дэрывацыі (г. зн. асноўных заканамернасцей структурнай арганізацыі СГ) у беларускай і рускай мовах пабудаваны графы СГ, якія прыводзяцца ў табліцах "Разнавіднасці СГ кампазітаў у беларускай і рускай мовах", напрыклад,

Репозиторий БрГУ

Табліца 2

Разнавіднасці СГ з выходнымі кампазітамі – найменнямі прадстаўнікоў жывёльнага свету ў беларускай і рускай мовах

Граф СГ	колькасць СГ		Граф СГ	колькасць СГ	
	бел.	рус.		бел.	рус.
$N \to A_1$	–	2	$N \to A_1$, $N \to N_2$	–	2
$N \to N_1$	2	–	$N \to A_1 \to N_2$	1	1

5. Сукупнасць індывідуальных СГ стварае зводнае словаўтваральнае гняздо, напрыклад,

Схема 4

Граф зводнага словаўтваральнага гнязда з выходнымі асабовымі кампазітамі ў беларускай і рускай мовах[1]



6. Акрамя гэтага, выкарыстаны часцінамоўныя мадэлі, якія адлюстроўваюць часцінамоўную прыналежнасць як кожнага матываванага слова ў СГ,так і яго матывавальнай базы. У той жа час яны (мадэлі) адлюстроўваюць "дэрывацыйную гісторыю слова" (Я.Л.Гінзбург), ці "словаўтваральную глыбінную структуру" (П.А.Собалева).Так, у СГ з вяршынямі – назвамі месца ў абедзвюх мовах матываваныя ўтвараюцца па 7 мадэлях:

Заўвага. Пры супадзенні матываваных у абедзвюх мовах рабро графа ўяўляе сабой суцэльную лінію: ——. Пры адсутнасці адпаведніка ў рускай мове беларускаму дэрывату ўжываецца сімвал .... Калі для рускага дэрывата няма адпаведніка ў беларускай мове, выкарыстоўваецца сімвал – – –.

Репозиторий БрГУ

назоўнікі: NN_1; NN_1N_2; $NN_1N_2N_3$;

прыметнікі: NA_1; NA_1A_2; $NN_1N_2A_3$;

дзеясловы: NV_1.

У заключэнні абагулены вынікі даследавання і ахарактарызавана спецыфіка падабенстваў і адрозненняў СГ з выходнымі кампазітамі ў беларускай і рускай мовах.

1. Словаўтваральны патэнцыял складанасуфіксальных назоўнікаў з дзеяслоўным кампанентам у абедзвюх мовах не вельмі высокі: так, з вылучаных 1171 беларускіх і 1517 рускіх кампазітаў (для многазначных слоў – ЛСВ кампазітаў) вяршынямі СГ выступаюць адпаведна 325 і 545. Гэты факт можна растлумачыць , у першую чаргу, дастатковай складанасцю – як семантычнай, так і структурнай – даследаваных назоўнікаў. Што тычыцца дэрывацыйных магчымасцей кампазітаў розных семантычных груп, то найбольш высокі ён у асабовых складанняў, у найменняў дзеяння і ў назваў машын, механізмаў, прыстасаванняў.

Акрамя семантыкі выходнага слова, структура словаўтваральнага гнязда абумоўлена таксама такімі фактарамі, як ўжывальнасць і прыналежнасць/непрыналежнасць вяршыні да тэрміналагічнай лексікі: звычайна найбольшая колькасць дэрыватаў утвараецца ад назоўнікаў, якія знаходзяцца па-за межамі тэрміналогіі. Выключэнне складаюць другасныя кампазіты, сфера ўжывання якіх – менавіта тэрміналогія.

2. Асноўная колькасць матываваных адзінак словаўтваральных гнёзд з выходнымі кампазітамі размеркавана па першай і другой ступенях дэрывацыі: з усіх даследаваных СГ аднаступеньчатыя і двухступеньчатыя складаюць у беларускай мове 99%, у рускай – 98,5%.Дарэчы, словаўтваральны патэнцыял кампазітаў – найменняў машын, механізмаў, прыстасаванняў, назваў прадстаўнікоў жывёльнага і расліннага свету, лакатыўных імён абмежаваны менавіта гэтымі дзвюма ступенямі. На долю трохступеньчатых і пяціступеньчатых СГ застаецца адпаведна ў беларускай мове 1% і 1,5% у рускай.

Адзначана, што ад ступені да ступені дэрывацыі не толькі памяншаецца колькасць матываваных слоў, але і падае "тыповасць" структуры СГ.

3. У словаўтваральных гнёздах з выходнымі складанасуфіксальнымі назоўнікамі ў абедзвюх мовах могуць быць прадстаўлены матываваныя чатырох часцін мовы: назоўнікі, прыметнікі (самыя шматлікія групы), дзеясловы, прыслоўі. Словы адных часцін мовы – назоўнікі (I, II, III і V ступені дэрывацыі) і прыметнікі (I, II,

Репозиторий БрГУ

III і IV) – характэрныя ў абедзвюх мовах для СГ з выходнымі складанымі словамі ўсіх семантычных груп. Дзеясловы (I, II, III) зафіксаваны ў гнёздах з вяршынямі – асабовымі назоўнікамі, найменнямі дзеяння, назвамі машын, механізмаў, прыстасаванняў. Прыслоўі (I , II, III і V) адзначаны ў СГ асабовых кампазітаў, найменняў дзеяння, назваў машын, механізмаў, прыстасаванняў.

4. Супастаўленне структуры гнёзд з вяршынямі – складана-суфіксальнымі назоўнікамі ў беларускай і рускай мове паказвае, што для значнай часткі СГ (206 беларускіх і рускіх гнёзд; 23%) яна аднолькавая. Пры гэтым канкрэтныя СГ, прадстаўленыя такімі графамі, могуць: А) супадаць поўнасцю, Б) супадаць часткова (гл. СГ з вяршынямі б.*сценапіс* і р.*стенопись*, б.*параход* і р.*пароход*, якія адпавядаюць графу $N \rightarrow N_1$, A_1):

А.	сценапіс	стенопись
	сценапіс-ец	стенопис-ец
	сценапіс-н(ы)	стенопис-н(ый)
Б.	параход	пароход
		пароход-ик
		пароход-ишк(о)
		пароход-чик
	параход-ств(а)	пароход-ств(о)
	параход-н(ы)	пароход-н(ый)
	параход-а-будаванне	пароход-о-стро-ениj(е)
		пароход-о-строи-тельн(ый)
		агит/пароход

Пры несупадзенні структуры СГ кампазітаў – міжмоўных эквівалентаў паміж графамі такіх гнёзд не існуе прынцыповых адрозненняў: лініі аднаго графа ў асноўным паўтараюць лініі другога, і разыходжанне адбываецца за кошт 1–2 ліній, напрыклад:

б.*самаход* (дзеянне) N і р.*самоход* N



Пры гэтым больш простае СГ як бы накладваецца на больш складанае.

Пры параўнанні словаўтваральных гнёзд выяўлены лакуны – адсутнасць аднаслоўных эквівалентаў. Так, у параўнанні з рускімі СГ

Репозиторий БрГУ

у беларускіх гнёздах часта адсутнічаюць дзеясловы (дарэчы, дзеясловы ад складаных слоў у беларускай мове ўтвараюцца менш актыўна), зусім не адзначаны прыналежныя прыметнікі (яны нешматлікія і ў рускай мове), радзей сустракаюцца ацэначныя найменні і другасныя кампазіты. На наш погляд, не заўсёды адсутнасць аднаслоўнага эквівалента (які патэнцыяльна не супярэчыць словаўтваральнай сістэме мовы) азначае наяўнасць лакуны: у пэўнай ступені гэта праблема не дэрывацыйнага патэнцыялу слоў, а лексікаграфічная. Тым не менш выяўленыя лакуны могуць сведчыць аб магчымых напрамках папаўнення слоўнікавага складу беларускай мовы, і ў першую чаргу – тэрміналогіі.

ВЫВАДЫ

Складанае слова як аб'яднанне мінімум дзвюх граматычных асноў уваходзіць у тры словаўтваральныя гнязды: два – па агульнасці адной са сваіх асноў і трэцяе, для якога кампазіт выступае вяршыняй.

У межах СГ складаныя словы аб'ядноўваюцца ў семантычныя групы. На семантычную разнастайнасць складанасуфіксальных назоўнікаў з дзеяслоўным кампанентам у беларускай і рускай мовах(найменні дзеяча, дзеяння, месца дзеяння, часу дзеяння) накладвае адбітак лексіка-граматычная прыналежнасць іх другога кампанента – да класа дзеясловаў. Утварэнне кампазітаў, што адносяцца да адной семантычнай групы, адбываецца пры дапамозе спецыфічных словаўтваральных сродкаў.

Структурна-семантычная арганізацыя СГ, што ўзначальваюцца складанасуфіксальнымі кампазітамі, абумоўлена семантыкай выходнага слова, а таксама яго ўжывальнасцю і прыналежнасцю/непрыналежнасцю да тэрміналагічнай лексікі.

Супастаўляльны аналіз СГ складанасуфіксальных назоўнікаў з дзеяслоўным кампанентам (маюцца на ўвазе як гнёзды, членамі якіх з'яўляюцца кампазіты, так і СГ з выходнымі складанымі словамі) паказаў, што словаўтваральныя працэсы ў беларускай і рускай мовах шмат у чым падобныя, паралельныя, што пацвярджаецца:

– агульнасцю асноўных семантычных груп складаных слоў у абедзвюх мовах;

– прыналежнасцю як кампазітаў, так і матываваных – членаў СГ з выходнымі кампазітамі да тоесных словаўтваральных катэгорый, а ў межах гэтых словаўтваральных катэгорый – супадзеннем для многіх

Репозиторий БрГУ

беларускіх і рускіх дэрыватаў словаўтваральных сродкаў;

– агульнасцю для СГ складаных слоў рада груп (катэгорый) матываваных.

У той жа час дэрывацыйная сістэма кожнай з разглядаемых моў развіваецца самастойна, па спецыфічных законах, характарызуецца самабытнасцю. Пра гэта (на матэрыяле СГ) сведчыць наступнае:

– адпаведнікамі складанасуфіксальных назоўнікаў з дзеяслоўным кампанентам, а таксама матываваных імі словамі могуць выступаць іншыя моўныя адзінкі;

– індывідуальнасць словаўтваральных сродкаў, пры дапамозе якіх утвараюцца кампазіты, а ў СГ кампазітаў – матываваныя імі адзінкі;

– у СГ складаных слоў назіраецца несупадзенне паміж рознымі групамі (катэгорыямі) матываваных.

СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ ПА ТЭМЕ ДЫСЕРТАЦЫІ

1. Синонимия в словообразовательных гнёздах сложных существительных // Материалы научной конференции, посвященной 100-летию акад.В.В.Виноградова.– Минск, 1995.– С.11-13.

2. Складаныя назоўнікі ў творах Максіма Гарэцкага // Словам адраджаць чалавека. Да 100-годдзя з дня нараджэння М.І.Гарэцкага. Тэз.дакл.і паведамленняў навук. канф. Ч.II.– Брэст, 1993.– С.6-8. (у суаўтарстве з Я.І.Абрамавай).

3. Словаўтваральны патэнцыял асабовых кампазітаў у беларускай і рускай мовах // Веснік БДУ. Серыя 4. – 1995, N3. – С.28-32.

4. Сложносуффиксальные существительные в русском и белорусском языках (типологическая характеристика)// Шануючы спадчыну Я.Карскага. Чацвёртыя навук. чытанні. Ч.II. – Гродно, 1994. – С.70-75.

5. Структура словообразовательных гнёзд с исходными композитами в русском и белорусском языках // Единство восточно-славянских народов: прошлое, настоящее, перспективы. Материалы научн.конференции. – Гомель, 1995. – С.178-180.

6. Типология гнёзд сложных слов в русском и белорусском языках // Беларуска-руска-польскае супастаўляльнае мовазнаўства і літаратуразнаўства. Матэрыялы Трэцяй міжнар. навук. канф. Ч.I – Віцебск, 1994. – С.67-70.

Репозиторий БрГУ

РЭЗЮМЭ

Гадуйка Людміла Аляксееўна

Словаўтваральныя гнёзды складанасуфіксальных назоўнікаў з дзеяслоўным кампанентам у беларускай і рускай мовах

Ключавыя словы: кампазіт, складанасуфіксальны назоўнік, матываваная адзінка, спосаб словаўтварэння, словаўтваральны тып, словаўтваральны фармант, словаўтваральнае гняздо (СГ), вяршыня СГ, ступень дэрывацыі, словаўтваральная зона, міжмоўны адпаведнік.

Аб'ектам даследавання з'яўляюцца словаўтваральныя гнёзды складанасуфіксальных назоўнікаў з дзеяслоўным кампанентам у беларускай і рускай мовах. Вывучэнне СГ кампазітаў праведзена ў два этапы: даследаванне СГ, членамі якіх выступаюць складаныя словы (мінімум два – па кожным з яго кампанентаў), і характарыстыка гнёзд, якія ўзначальваюцца кампазітамі.

На першым этапе апісаны асноўныя семантычныя групы і структурныя тыпы складанасуфіксальных назоўнікаў з дзеяслоўным кампанентам; выяўлена залежнасць семантычнай разнастайнасці разгледжаных дэрыватаў ад лексіка-граматычнай прыналежнасці іх другога кампанента; ахарактарызаваны моўныя адзінкі, якія могуць выступаць міжмоўнымі адпаведнікамі такіх слоў. Упершыню ў СГ кампазітаў разгледжаны парадыгматычныя адносіны, выяўлены фактары, што ўплываюць на іх узнікненне.

На другім этапе праведзена даследаванне структурна-семантычнай будовы СГ з выходнымі складанасуфіксальнымі назоўнікамі ў беларускай і рускай мовах, апісаны прычыны, што ўплываюць на словаўтваральны патэнцыял кампазітаў. Праведзена супастаўляльная характарыстыка структурнай арганізацыі і семантычных адносін паміж матываванымі адзінкамі СГ з выходнымі складанымі словамі ў беларускай і рускай мовах.

Вынікі дысертацыі могуць быць выкарыстаны ў практыцы выкладання словаўтварэння сучасных беларускай і рускай моў. Вынікі супастаўляльнага даследавання могуць знайсці прымяненне пры стварэнні перакладных, у тым ліку і гнездавых, слоўнікаў, пры падрыхтоўцы адпаведных раздзелаў супастаўляльных граматык беларускай і рускай моў.

Репозиторий БрГУ

РЕЗЮМЕ

Годуйко Людмила Алексеевна

Словообразовательные гнёзда сложносуффиксальных существительных в белорусском и русском языках

Ключевые слова: композит, сложносуффиксальное существительное, мотивированная единица, способ словообразования, словообразовательный тип, словообразовательный формант, словообразовательное гнездо (СГ), вершина СГ, ступень деривации, словообразовательная зона, межъязыковое соответствие.

Объектом исследования являются словообразовательные гнёзда сложносуфиксальных существительных с глагольным компонентом в белорусском и русском языках. Изучение СГ композитов проведено в два этапа: исследование СГ, членами которых выступают сложные слова (минимум два – по каждому из его компонентов), и характеристика гнёзд, которые возглавляются композитами.

На первом этапе описаны основные семантические группы и структурные типы сложносуффиксальных существительных с глагольным компонентом; выявлена зависимость семантического разнообразия рассмотренных дериватов от лексико-грамматической принадлежности их второго компонента; охарактеризованы языковые единицы, которые могут выступать межъязыковыми соответствиями таких слов. Впервые в СГ композитов рассмотрены парадигматические отношения, выявлены факторы, которые влияют на их возникновение.

На втором этапе проведено исследование структурно-семантического строения СГ с исходными сложносуффиксальными существительными в белорусском и русском языках, описаны причины, которые влияют на словообразовательный потенциал композитов. Дана сопоставительная характеристика структурной организации и семантических отношений между мотивированными единицами СГ с исходными сложными словами в белорусском и русском языках.

Результаты диссертации могут быть использованы в практике преподавания словообразования современных белорусского и русского языков. Итоги сопоставительного исследования могут найти применение при создании переводных, в том числе и гнездовых, словарей, при подготовке соответствующих разделов сопоставительных грамматик белорусского и русского языков.

Репозиторий БрГУ

SUMMERY

GODUIKO, Liudmila Alexeyevna

Formative Families of Compound Suffix Nouns in Russian and Byelorussian

Key words: composite, compound suffix noun, motivated unit, way of word formation, formative type, formative part, formative family (FF), height of FF, level of derivation, formative zone, interlinguistic equivalent.

The subject of this research is the formative families of compound suffix nouns with a verb component in Byelorussian and Russian. The investigation of FF composites has been com'ed out in two stages: investigation of FFs having not less than two compound words (containing each of the components) as its members and the description of the families headed by the composites.

In the initial stage the main semantic groups and structural types of compound suffix nouns with a verb component have been described; a dependence of semantic diversity of the examined derivates on a lexico-grammatical duality of their second element has been revealed; the linguistic units which can act as interlinguistic equivalents of such words have been described. For the first time paradigm relations within composite FFs have been investigated, and the factors influencing their appearance revealed.

The second stage saw the investigation of Russian and Byelorussian FF structural and semantic composition, the FFs having the initial compound suffix nouns; the reasons influencing the formative potential of composites have been described. A comparative characteristics is presented showing the structural organization and semantic relations between the FF motivated units and the initial compound words in Russian and Byelorussian.

The thesis findings can be used in practical teaching of word formation in the contemporary Byelorussian and Russian languages. The results of this comparative investigation can find use in compiling translation dictionaries including family-type dictionaries; in writing the relevant sections of comparative grammars of Russian and Byelorussian.

Репозиторий БрГУ